контроля настаивала, что налоговый орган мог не выплачивать компенсацию в сумме 118,04 злотых за неиспользованный отпуск. Но руководитель казённой палаты отстаивал права своего сотрудника, ссылаясь на тяжёлое материальное положение и отсутствие карьерных перспектив немолодого Филимонова (судя по всему, сотрудник был православным, что и затрудняло его карьерный рост в условиях государственной ассимиляции – Б. К.) [11, л. 50].

Большим информационным потенциалом обладают протоколы заседаний съездов начальников правлений, которые содержатся в Фондах 50 и 53. В таких протоколах подробно описываются трудности и достижения налоговых органов – начиная с материального положения учреждений и заканчивая критикой и предложениями по совершенствованию налогового законодательства [10, л. 1–3].

Также важны фонды органов местного управления и самоуправления. В ГАБО находится 37 фондов гминных правлений поветов Полесского воеводства (гмина – территориальная единица повета, в свою очередь из поветов состояло воеводство), по материалам которых возможно исследовать практику налогообложения в сельской местности. Местные налоги, натуральные повинности и их размеры имели свою специфику и зависели от конкретной территории. Расходы гмины ложились на плечи населения. На каждый финансовый год в поветах утверждались Статуты о повинностях и дорожных свидетельствах для каждой гмины. Статуты регламентировали шарварки – повинность, заключающуюся в общественных работах по благоустройству дорог и местности [2, л. 4]. Проблемой шарварков и источниковой базы данной темы продуктивно занимался А. А. Савич [13].

Существовали и другие натуральные повинности. Например, в октябре 1938 года в гмине Жабинка Кобринского повета каждый двор громады Федьковичи должен был предоставить сечку (мелко нарезанную солому) из одного снопа с целью подготовки глины для укладки пола в школе-памятнике имени Ю. Пилсудского. Также громада на строительство школы должна была предоставить строительных услуг стоимостью 3 000 злотых и 500 злотых деньгами. А в июне 1938 года все гмины Кобринского повета должны были предоставлять безвозмездно подводы для транспортировки металлолома, собранного в рамках акции по поддержке национальной обороны (F.O.N.) [1, л. 31, 53, 58].

Таким образом, мы можем сделать вывод, что документы фондов ГАБО затрагивают практически все стороны системы налогообложения на территории Западной Беларуси и могут быть эффективно использованы при проведении исследований по данной тематике.


1. Государственный архив Брестской области (далее – ГАБО). – Ф. 45. Оп. 1. Д. 15.
2. ГАБО. – Ф. 45. Оп. 1. Д. 18.
3. ГАБО. – Ф. 50. Оп. 1. Д. 21.
4. ГАБО. – Ф. 50. Оп. 1. Д. 23.
5. ГАБО. – Ф. 50. Оп. 1. Д. 3422.
6. ГАБО. – Ф. 50. Оп. 1. Д. 3439.
7. ГАБО. – Ф. 50. Оп. 1. Д. 4728.
8. ГАБО. – Ф. 50. Оп. 1. Д. 4743.
9. ГАБО. – Ф. 50. Оп. 1. Д. 5609.
10. ГАБО. – Ф. 53. Оп. 1. Д. 4.
11. ГАБО. – Ф. 53. Оп. 6. Д. 18.
12. Дементьева, Н. М. Налоговая политика государства [Электронный ресурс] / Н. М. Дементьева // Новосибирский государственный университет экономики и управления (НГУЭУ). – 2009. – Режим доступа: https://is.gd/gLQBOo. – Дата доступа: 12.03.2023.
13. Савич, А. А. Шарваркі ў Заходняй Беларусі 1921–1939 гг. у кантэксце гістарыяграфічнага асэнсавання [Электронный ресурс] / А. А. Савич // Электронная библиотека БГУ. – 2015. – Режим доступа: https://is.gd/qLBDGY. – Дата доступа: 10.03.2023.
14. Jezierski, A. Historia gospodarcza Polski / A. Jezierski, C. Leszczyńska. – Warszawa : Key Text, 1999.


**Згірскі Ю.І.**

## АНКЕТАВАННЕ ПРЫ РЭГІСТРАЦЫІ БЕЖАНЦАЎ У СПРАВАВОДСТВЕ ЖАСНЯНСКАЙ ГМІНЫ МІЖВАЕННАЙ ПОЛЬШЧЫ ЗА 1920-Я ГАДЫ

Адной з характэрных рыс Першай сусветнай вайны стаў феномен масавага бежанцтва мірнага насельніцтва з зоны баявых дзеянняў. Ня гледзячы на падпісанне Брэсцкай дамовы паміж Савецкай Расіяй і блокам Цэнтральных дзяржаў і, як вынік, выхада Расіі з Першай сусветнай вайны, паляпшэнне становішча на тэрыторыі Беларусі пачалося толькі ў канцы 1920 г., што звязана са сканчэннем фазы актыўных баявых дзеянняў польска-савецкай вайны. Дзякуючы архіўным матэрыялам, інсуе магчымасць даследаваць механізм рэгістрацыі бежанцаў на тэрыторыі Жаснянскай гміны ІІ Рэчы Паспалітай. Дзякуючы цэнтралізаванаму характару і агульнасці норм бюракратычных працэсаў на тэрыторыі міжваеннай Польшчы, матэрыялы са звышэйзгаданнай гміны можна выкарыстоўваць пры даследаванні падобных працэсаў у іншых рэгіёнах Заходняй Беларусі.

Перад разглядам бюракратычнага працэса, неабходна разглядзець адміністрацыйна-тэрытарыяльныя змены на тэрыторыі Віленскай губерніі, у склад якой ўваходзілі землі створанай ў 1919 г. Жаснянскай гміны:

- 1914–1917 гг. – Жаснянская воласць Віленскай губерніі Расійскай імперыі.
- 1919–1920 гг. – Жаснянская гміна Вілейскага павета Наваградскага ваяводства пры Грамадзянскім ўрадзе ўсходніх зямель (польск. Zarząd Cywilny Ziem Wschodnich) Польскай Рэспублікі.
- 1920–1926 гг. – Жаснянская гміна Дунілавіцкага павета Наваградскага ваяводства (заўв. з 1922 г. па 1926 г. – Віленскай зямлі).
- 1926–1939 гг. – Жаснянская гміна Пастаўскага павета Віленскага ваяводства.

Пачынаючы з 1920 г., у матэрыялах справаводства Жаснянскай гміны Дунілавіцкага павета фіксуецца вяртанне бежанцаў [11]. З мэтай рэгістрацыі экс-бежанцаў, грамадзянскімі органамі улады быў арганізаваны механізм фіксацыі асоб, якія праходзілі рэгістрацыю і/ці перарэгістрацыю на тэрыторыі Жаснянскай гміны. Адказнасць за ажыццяўленне працэсу была ўскладзена на мясцовыя органы ўлады (старасты) пры кантролі грамадзянскіх органаў улады і Міністэрства ўнутранных спраў [8]. Фіксацыя праводзілася цэнтралізавана, нормы і правілы правядзення бюракратычнага працэсу былі аднолькавыя для ўсіх гмін [9].

Асноўная форма фіксацыі асоб – анкетаванне. Яно пачало выкарыстоўвацца пры рэгістрацыі экс-бежанцаў з 1920 г. Анкеты мелі розныя варыянты, якія фактычна, мала чым адрозніваліся паміж сабой. У анкетаванне ўваходзіла:

- Імя, фамілія.
- Месца і час нараджэння.
- Узрост.
- Час і месца, куды выехаў бежанец.
- Месца прапіскі.
- Род дзейнасці.
- Служба ў войску.
- Веравызнанне.
- Нацыянальнасць.
- Сямейнае становішча і склад сям'і.
- Валоданне мовамі.
- Удзел ў арганізацыі польскіх органаў улады.
- Служба ў войску [9].

Анкетаванне вялося на польскай мове. Напісанне імя і асабістых дадзеных вялося ў адпаведнасці з нормамі польскай мовы. Ня гледзячы на напісанне дакладнай даты ў графе "Дата нараджэння", дата, пазначаная ў гэтай графе, выклікае сумнеў, так як асоба магла ўказаць дату хрышчэння замест даты нараджэння, спасылаючыся на метрычныя кнігі, якія выкарыстоўваліся пры запаўненні анкеты.

Метрычныя кнігі і выпіскі з іх выкарыстоўваліся не толькі з мэтай вызначэння даты нараджэння і/ці хросту, але і для паццверджання асобы. У гэтых мэтах праводзілася параўнанне запісаў у метрычных кнігах, аўтабіяграфіі і дакументаў, якія падаваліся асобай пры рэгістрацыі, а таксама сведчанні сведкі, прадстаўленай экс-бежанцам з мясцовага насельніцтва [3].

Мова аўтабіяграфій – польская і руская ў дарэвалюцыйнай арфаграфіі [7]. Аўтабіяграфіі ахоплівалі перыяд з 1914 па год напісання аўтабіяграфіі. Звычайна, аўтабіяграфіі ўтрымлівалі інфармацыю аб асобе, якая супадала па змесце з іншымі дакументамі, пададзенымі экс-бежанцам для рэгістрацыі. Напрыклад: веравызнанне. Цікавым фактам з'яўляецца пазначэнне нацыянальнасці без прывязкі да веравызнання. Так, згодна з дакументамі, вылучаецца катэгорыя асоб каталіцкага веравызнання, якая пазначала ў аўтабіяграфіях беларускую нацыянальную прыналежнасць [5]. На сённяшні дзень немагчыма дакладна вызначыць час выезду з тэрыторыі Жаснянскай гміны, што звязана са спецыфікай сітуацыі ваеннага часу. Самая ранняя дата выезду з тэрыторыі даваеннай Жаснянскай воласці, зафіксаванай у матэрыялах справаводства, з'яўляецца 1 верасня 1914 г. [4].

Адначасова з аўтабіяграфіямі і метрычнымі кнігамі і выпіскамі з метрычных кніг, экс-бежанцам падаваліся:

- Пасведчанне аб вайсковай павіннасці (рус. Свидетельство о воинской повинности). Яны выкарыстоўваліся пры запаўненні пунктаў, звязаных са службай у войску. Вызначыць дакладны час пачатку мабілізацыі мясцовага насельніцтва ў Рускую імператарускую армію немагчыма праз незахаванасць значнай часткі дакументаў. Самы ранні год, пазначаны як час прызыва ў войска – 1915 г. [2] Факт мабілізацыі з тэрыторыі Жаснянскай воласці ў 1915 годзе сведчыць пра захаванасць мабілізацыйнага рэзерву і, як вынік, з'яўляецца сведчаннем паступовага выезду часткі насельніцтва з воласці з 1914 г.
- Вусныя звароты насельніцтва: прадстаўлены дакументамі, складзенымі пры мясцовых органах улады на падставе вусных сведчанняў асобы пры звяртанні апошняй з заяўленнем на выдачу спраўкі ці пасведчання асобы [1]. З'яўленне падобнай катэгорыі дакументаў магчыма звязана са звяртаннем у мясцовыя органы ўлады маладукаванай ці неадукаванай часткі насельніцтва.

- Фіксацыя факта пражывання асобы на тэрыторыі Жаснянскай воласці былой Віленскай губерніі на момант 1 верасня 1914 г. у дакументах справаводства мясцовых даваенных органаў улады [3].

- Даваенныя расійскія (заўв. дарэвалюцыйныя) пасведачанні асобы, як адна з крыніц для паццверджання факта пражывання апошняй да Першай сусветнай вайны. Гэты масіў дакументаў фактычна адсутнічае, так як, у моц абставін, дакументы маглі быць страчаны асобай пад час Першай сусветнай вайной [3]. Магчымай прычынай адсутнасці дакументаў у матэрыялах справаводства Жаснянскай гміны Дунілавіцкага павета (з 1926 г. – Пастаўскага павета) з'яўляецца знічшэнне дарэвалюцыйных пасведчанneў асоб пасля выдачы польскіх дакументаў, так як першыя ўжо пераставалі дзейнічаць у моц знікнення органаў іх выдачы і Расійскай імперыі ўвогуле.

Захаванне анкеты ў матэрыялах справаводства сведчыць аб паспяховым праходжанні працэса рэгістрацыі экс-бежанца. Апошні, па выніках рэгістрацыі, атрымліваў пасведчанне аб нараджэнні [5]. З мая 1921 г., пасля сканчэння польска-савецкай вайны, пачалася выдача легітымацый (заўв. пасведчанне асобы). Працэдура анкетавання асоб захавалася да 1939 г. і распаўсюдзілася на справаводствы іншых дзяржаўных устаноў міжваеннай Польшчы [12, с. 28].

Запаўненне анкеты праводзілася на падставе дакуменаў, прадстаўленых асобай пры рэгістрацыі і/ці перарэгістрацыі (аўтабіяграфія, даваенныя дакументы, метрычныя кнігі і інш.) і матэрыялаў справаводства мясцовых даваенных органаў улады. Мова анкет – польская. Мова аўтабіяграфій – польская і руская, што звязана з распаўсюдам рускамоўнай адукацыі і валоданнем польскай мовай часткай насельніцтва. Фіксуюцца эпізоды звяртання ў дзяржустановы маладукаванай ці неадукаванай часткі насельніцтва, што фіксуецца ў матэрыялах справаводства мясцовых органаў улады. Па выніку рэгістрацыі, у межах якой праводзілася анкетаванне, асобе выдавалася часовае пасведчанне асобы, а пасля падпісання Рыжскай мірнай дамовы, з мая 1921 г., пачалася выдача пастаянных пасведчанняў асоб. Даваенныя рускія пасведчанні асобы не захаваліся ў матэрыялах справаводства Дунілавіцкага павета, што звязана як са стратай апошніх так і стратай сэнсу ў захоўванні недзейных дакументаў.


1. Занальны дзяржаўны архіў г. Маладэчна (далей – ЗДАМал.). – Ф. 56. Воп. 1. Спр. 11. Л. 26.
2. ЗДАМал. – Ф. 56. Воп. 1. Спр. 19. Л. 2.
3. ЗДАМал. – Ф. 56. Воп. 1. Спр. 35. Л. 1.
4. ЗДАМал. – Ф. 56. Воп. 2. Спр. 8. Л. 3.
5. ЗДАМал. – Ф. 56. Воп. 2. Спр. 8. Л. 21.
6. ЗДАМал. – Ф. 56. Воп. 2. Спр. 8. Л. 23.
7. ЗДАМал. – Ф. 56. Воп. 2. Спр. 8. Л. 81.
8. ЗДАМал. – Ф. 56. Воп. 2. Спр. 8. Л. 94.
9. ЗДАМал. – Ф. 56. Воп. 2. Спр. 8. Л. 128.
10. ЗДАМал. – Ф. 56. Воп. 2. Спр. 8. Л. 220.
11. ЗДАМал. – Ф. 388. Воп. 1. Спр. 4. Л. 2.
12. Згірскі, Ю. І. Латвійскі напрамак працоўнай эміграцыі ў дакументах гарадскога суда мястэчка Друя ІІ Рэчы Паспалітай / Ю. І. Згірскі // Электронный сборник трудов молодых специалистов Полоцкого государственного университета имени Евфросинии Полоцкой / ред. кол.: Ю. Я. Романовский (пред.) [и др.]. – Новополоцк : Полоцкий государственный университет имени Евфросинии Полоцкой, 2022. – Вып. 43 (113): Образование. Педагогика. – С. 28–30.


**Ананька К.Д.**

## УСПАМІНЫ ЯК КРЫНІЦЫ ПА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКІХ ГІМНАЗІЙ У МІЖВАЕННАЙ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ

У сучаснай беларускай гістарыяграфіі ўспаміны выкарыстоўваюцца як крыніцы для даследавання пастаўленай праблемы. У савецкай гістарыяграфіі ўспаміны і мемуары класіфікаваліся даследчыкамі як суб'ектыўныя крыніцы і выкарыстоўваліся ў якасці дадатку да іншых дакументаў. У сувязі з пашырэннем выкарыстання новых метадалагічных падыходаў у 1990-х гг. заходняй гістарычнай навуцы, а затым і ў беларускай стала папулярным выкарыстанне эга-дакументаў з мэтай даследавання асобных праблем. Эга-дакументы – катэгорыя шырокага значэння, якая ўключае ўспаміны, мемуары, пратаколы апытанняў, жыццяпісу, эпісталярныя крыніцы і г. д.

У апошні час у гістарычным навуковым дыскурсе папулярным становіцца выяўленне і стварэнне біяграфій раней невядомых або малавывучаных дзеячаў, а таксама прасапаграфічныя даследаванні – пабудова калектыўных біяграфій асобных катэгорый людзей. На думку даследчыка беларускага нацыянальнага руху ў Заходняй Беларусі А. С. Горнага падобныя даследаванні патрабуюць грунтоўнага аналізу асабістых дакументаў, у тым ліку і ўспамінаў. Вывучэнне ўласнага «я» дазваляе ўбачыць інтэлектуальныя магчымасці і пошукі беларускіх нацыянальных дзеячаў, складанасці іх выбару і ў цэлым умовы іх дзейнасці [1, с. 295]. Да крыніц па разглядаемай тэме адносяцца ў асноўным ужо апублікаваныя ўспаміны былых супрацоўнікаў і навучэнцаў гімназій – Янкі Багдановіча [2], Ігара